**24.** Дадзены сказы:

*1. Гётэ ў свой час сказаў, што_ каб лепш зразумець паэта, патрэбна пабываць на яго радзіме.*

*2. Змястоўную, але малавывучаную старонку_ ў жыцці М. Гарэцкага займае рэдактарска-выдавецкая дзейнасць.*

*3. Яшчэ не высахлі на мяккіх_ лясных травінках бурштынавыя кроплі буйной расы.*

У якім сказе на месцы пропуску трэба паставіць коску?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такога сказа. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**25.** Дзе нарадзіўся вядомы беларускі пісьменнік, паэт, драматург, рэдактар і грамадскі дзеяч Цішка Гартны (Зміцер Хведаравіч Жылуновіч)?

**А)** у Мінску. **Б)** у Слуцку. **В)** у Магілёве. **Г)** у Капылі. **Д)** у Кобрыне.

---

**26.** У 1962 годзе раман Івана Мележа “Людзі на балоце” выйшаў з друку і быў удастоены прэміі імя Якуба Коласа. Ілюстрацыі да твора сёння лічаць класікай кніжнай ілюстрацыі. Хто з’яўляецца аўтарам ілюстрацый да рамана?

**А)** Георгій Паплаўскі. **Б)** Наталля Паплаўская. **В)** Барыс Аракчэеў.
**Г)** Ніна Шчасная. **Д)** Леанід Шчамялёў.

---

**27.** Вам знаёмы мастакі слова: *1) Янка Купала; 2) Цётка; 3) Францішак Багушэвіч*. Якія творы належаць іх пяру?

*а) “Скрыпка беларуская”; б) “Дудка беларуская”; в) “Жалейка”.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в. **Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**28.** Гэты мастак слова ў вольны час вельмі любіў збіраць грыбы. Аднойчы за адзін дзень назбіраў аж 500 баравікоў. Сваім сябрам часта адпраўляў у падарунак высушаныя грыбы. Сам сябе жартам называў “міністрам грыбной гаспадаркі”. Пра каго ідзе размова?

**А)** пра Максіма Танка. **Б)** пра Міхася Лынькова. **В)** пра Язэпа Лёсіка.
**Г)** пра Якуба Коласа. **Д)** пра Кандрата Крапіву.

---

**29.** Як называецца часопіс, галоўным рэдактарам якога ў 1940 годзе быў П. Броўка?

**А)** “Бярозка”. **Б)** “Вожык”. **В)** “Маладосць”. **Г)** “Полымя”. **Д)** “Нёман”.

---

**30.** Старажытнагрэчаскі вучоны, гісторык … яшчэ ў V стагоддзі да н. э. у сваёй працы называў Дняпро Барысфенам, што значыць “рака з Поўначы”.

**А)** Піфагор. **Б)** Герадот. **В)** Сакрат. **Г)** Платон. **Д)** Геракліт.

---

КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 5. Тыраж 11200 экз. 2022 г. Мінск.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2022»

*Чацвер, 17 лютага 2022 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Шмат захавалася народных песень. У свой час дзяўчаты, напрыклад, спявалі:

*Не хадзіце, мае хлопчыкі, каля маёй хаты.*
*Не тапчыце вы, малойчыкі, мае руты-мяты.*
*Не для вас яе пасеяла, штодзень палівала.*
*Для таго яе пасеяла, каго я кахала…*

Падкрэсленае слова з’яўляецца … .

**А)** пабочным словам.
**Б)** выклічнікам. **В)** звароткам.
**Г)** устаўной канструкцыяй. **Д)** параўнальным зваротам.

---

**2.** Колькі ўсяго зваротных дзеясловаў (калі паўтараюцца, лічыць асобна) ужыта ў вершаваных радках А. Пысіна?

*Узяла бліскавіцамі,*
*усміхалася зарніцамі,*
*Папараццю цвіла.*
*Усміхалася, смяялася,*
*у возеры купалася*
*Да белага святла.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 4. **Д)** 6.

---

**3.** Дадзены словазлучэнні:

*1) чытаць кнігу; 2) птушыны звон; 3) помнік героям; 4) на захадзе сонца.*

У якіх з іх правільна падкрэслена залежнае слова?

**А)** ва ўсіх. **Б)** у 1, 2. **В)** у 1, 4. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**4.** Вы, напэўна, з захапленнем чыталі творы такіх пісьменнікаў, як

*1) Тарас Шаўчэнка; 2) Янка Маўр; 3) Янка Журба; 4) Віталь Біянкі; 5) Павел Бажоў.*

Выберыце з дадзеных прозвішчы беларускіх мастакоў слова.

**А)** усе дадзеныя прозвішчы. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**5.** Якія словы з прапанаваных правільна напісаны?

*1) капрычыо; 2) адажыё; 3) радыё; 4) трыа.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**6.** Лексічнаму значэнню ‘вельмі спрытны, умелы хто-небудзь’ адпавядае ўстойлівае спалучэнне … .

**А)** абедзве рукі левыя. **Б)** усе козы ў золаце. **В)** хоць з камня лыка надзяры.
**Г)** з ветру вяроўкі саўе. **Д)** зачапіцца языком за плот.

---

**7.** У форме творнага склону спалучэнне ***чацвёра вучняў*** пішацца … .

**А)** чацвёрамі вучнямі. **Б)** чацвёрымі вучнямі. **В)** чацверымі вучнямі.
**Г)** чацвярымі вучнямі. **Д)** чацвярмі вучнямі.

---

**8.** Дадзены словы: *1) р..ц..нзент; 2) р..ц..птар.* Якія літары прапушчаны?

**А)** а, а. **Б)** а, э. **В)** э, э. **Г)** э, ы. **Д)** ы, э.

---

**9.** Дадзены словазлучэнні:

*1) адмахівацца ад камара; 2) падпісываць паштоўку; 3) абнадзейваць гледача.*

У якім, ці якіх з іх дзеясловў напісаны правільна?

**А)** ва ўсіх. **Б)** няма такога. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**10.** У былыя часы дбайныя вясковыя гаспадары ў мэтах гігіены трымалі для гасцей асобны кубак, якім самі не карысталіся. Як называўся такі кубак?

**А)** фарфоравы. **Б)** жалезны. **В)** алюмініевы. **Г)** паганы. **Д)** патрэбны.

---

**11.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце літару ***э***?

*1) р..ванш; 2) р..торыка; 3) р..зананс.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**12.** Дадзены назоўнікі: *1) абутак; 2) смутак; 3) бераг; 4) начлег.* Выберыце тыя назоўнікі, якія ў форме адзіночнага ліку меснага склону маюць канчатак ***у***.

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**13.** Якія словы з дадзеных напішаце разам?

*1) ашчад(банк); 2) спарт(зала); 3) канц(тавары).*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**14.** У якім сказе ці сказах выказнік ужыты ў правільнай форме?

*1. Луг зялёны, сенажаць, лес дрымучы песнямі птушынымі звініць.*
*2. Мінулі тыдні тры, і пачалася адліга.*
*3. Хтосьці з іх нешта сказаў пра экскурсію ў музей.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такога сказа. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**15.** У народзе здаўна гавораць: *“Такая зямля добрая: пасадзі аглоблю – калёсы вырастуць”.* Які від сказа?

**А)** просты сказ. **Б)** складаназалежны сказ. **В)** складаназлучаны сказ.
**Г)** бяззлучнікавы сказ. **Д)** складаны сказ з рознымі відамі сувязі.

---

**16.** Калі прыслоўе паясняе ў сказе назоўнік (напрыклад: *Вокны* ***насупраць*** *прыцягвалі ўвагу*), яно з’яўляецца … .

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапасаваннем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**17.** Хто з герояў рамана І. Мележа “Людзі на балоце” разважаў: “*Уся сіла чалавека – у зямлі. І сіла ўся, і радасць! Няма зямлі – няма, лічы, і чалавека*”?

**А)** Васіль. **Б)** Ганна. **В)** Яўхім. **Г)** Халімон. **Д)** Міканор.

---

**18.** У старажытнасці еўрапейскія алхімікі для перадачы значэнняў колераў карысталіся словамі: *1) нігрэда; 2) рубеда; 3) альбеда.* Якія назвы колераў ім адпавядаюць?

*а) чырвоны; б) чорны; в) белы.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-а. **Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**19.** Для вядомага ўсім пісьменніка Івана Шамякіна жонка была сапраўднай музай. Ёй мастак слова прысвяціў сваю першую аповесць “Непаўторная вясна” і адну з апошніх – “Слаўся, …!”.

**А)** Таццяна. **Б)** Марыя. **В)** Алеся. **Г)** Ліна. **Д)** Саша.

---

**20.** Як вядома, для А. С. Пушкіна месцам натхнення было Міхайлаўскае, для Л. М. Талстога – Ясная Паляна. А для У. С. Караткевіча – горад … . Сюды пісьменнік часта ўцякаў ад гарадской мітусні і жыццёвых нягод, каб адпачыць душою, добра папрацаваць, знайсці падтрымку і разуменне блізкіх.

**А)** Астравец. **Б)** Столін. **В)** Мінск. **Г)** Рагачоў. **Д)** Полацк.

---

**21.** Жыццёвым дэвізам класіка беларускай літаратуры Кандрата Крапівы былі словы: “*Я хацеў умяшацца ў жыццё і тое-сёе ў ім … .*” Які дзеяслоў прапушчаны?

**А)** узгадаць. **Б)** зрабіць. **В)** забыць. **Г)** упрыгожыць. **Д)** падправіць.

---

**22.** Вы, напэўна, чыталі кнігу казак “Тысяча і адна ноч”. Які твор беларускага мастака слова параўноўваюць з гэтай кнігай?

**А)** паэму “Новая зямля” Якуба Коласа.
**Б)** “Палескую хроніку” Івана Мележа.
**В)** зборнік “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” Яна Баршчэўскага.
**Г)** паэму “Тарас на Парнасе” К. Вераніцына.
**Д)** пенталогію “Трывожнае шчасце” Івана Шамякіна.

---

**23.** Верш “Александрына” П. Броўка прысвяціў дзяўчыне з васільковымі вачыма і светлымі косамі, якая была актрысай Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Хто яна?

**А)** Ніна Левашова. **Б)** Стэфанія Станюта. **В)** Галіна Кругляк.
**Г)** Ала Доўгая. **Д)** Зінаіда Канапелька.